# МОВА ЯК СРОДАК АСІМІЛЯЦЫІ СЯРОД ХРЫСЦІЯНСКІХ ВЕРНІКАЎ Ў ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ 1921–1939 гг.

**Дудкін Яўгеній Якаўлевіч**
настаўнік гісторыі і грамадазнаўства дзяржаўнай установы адукацыі «Сярэдняя школа № 1 г.п. Бялынічы імя М.І. Пашкоўскага»
(г.п. Бялынічы, Беларусь)

Згодна канстытуцыі Польшчы 1921 г. Рыма-каталіцкі Касцёл аб'яўляўся першым сярод роўных, аднак менавіта Касцёл, з пункту гледжання улад, павінен быў стаць тым інструментам уздзеяння на беларускае насельніцтва з мэтаю яго паланізацыі [3, с. 306]. Меліся напады з боку польскіх вышэйшых і сярэдніх колаў на віленскага біскупа Матулевіча, які “разумеў, што каталіцызм не “польская вера”, і паслядоўна дапускаў ужыванне беларускай і літоўскай моваў у душпастырскай працы” [11, с. 74]. Ксёндз-беларус В. Гадлеўскі некалькі разоў аказваўся зняволеным толькі за тое, што ім былі праведзены імшы на



нный архив библиотеки МГУ имени А.А.Ку

беларускай мове. Дадзеныя абставіны выклікалі неспакой беларусаў-каталікоў. Так, пад час чытання святаром-палякам казання на польскай мове "народ абурыўся" і "нават песьняй перарваў пробашчу польскую навуку", у выніку чаго "паліцыя арыштавала 17 чалавек" [10, с. 74].

З сярэдзіне 1930-х гг. у некаторых праваслаўных храмах пачалі праводзіцца службы на польскай мове: Гродна і Беластоку з 11 лістапада 1935 г [5, с. 309]. У 1935 ў Беластоку было створана Таварыства праваслаўных палякаў імя Ю. Пілсудскага, у 1936 г. у іншых гарадах. Гродна стала цэнтрам праваслаўных палякаў пад кіраўніцтвам біскупа Савы, які згадзіўся "ўводзіць казаньні на польскай мове", а царкоўныя хоры спяваць на заканчэнне літургіі польскія патрыятычныя песьні. Так, з падачы маршала Рыдз-Сміглы з 1937 г. рэалізоўваўся наступны этап паланізацыі, які мусіў ахапіць Віленшчыну, Гарадзеншчыну, Беласточчыну з мэтаю стварэння польскай абалонкі рэлігійнага жыцця праваслаўных [6, с. 188–189]. Як вынік рэалізацыі падобнай палітыкі "у Віленскім ваяводстве дасягнута дамоўленасць паміж уладамі і праваслаўнымі іерархіяй аб тым, што ў польскіх школах праваслаўная рэлігія павінна выкладацца на дзяржаўнай польскай мове" [2, с. 43].

У войску "праваслаўныя капеланы павінны былі пераканаць жаўнераў-беларусаў у тым, што праваслаўе не перашкаджае быць палякам". Як вынік такой працы – павялічэнне колькасці вайскоўцаў, якія дэкларавалі сябе як праваслаўныя палякі. У снежні 1938 г. Ваеннае міністэрства выдала спецыяльную дэрыктыву, у якой адзначалася, што "мэтаю польскай аўтакефальнай праваслаўнай царквы з'яўляецца хутчэйшая паланізацыя беларусаў" [4, с. 22]. Дадзеная палітыка падмацоўвалася актыўным удзелам праваслаўных салдат Войска Польскага ў правядзенні значных рэлігійных святаў, напрыклад Хроснага шляху, які адбыўся ў Брэсце, аб чым сведчаць фотаздымкі 1930-х гг. [7, с. 110].

Правядзенне дзяржавай палітыкі паланізацыі праз дзейнасць Ўніяцкай Царквы правалілася. Так, па-першае, колькасць вернікаў згодна дадзеных часопіса "Przegląd Katolicki" не была высокай: у 1927 г. каля 20 000 чалавек, напрыканцы верасня 1939 г. – усяго каля 7 700 – 10 000 уніятаў [1, с. 445]. Тым больш, пашырэнню ўніі польскія улады не спрыялі, бачыўшы ў ёй асяродак беларускасці. У лютым 1939 г. дырэктар дэпартамента веравызнанняў Г Дунін-Баркоўскі адзначаў асноўны мінус усходняга абраду ў тым, што той "быў дзвярыма, праз якія ўцякае няпольскі элемент, прыцiснуты дзяржаўнай палітыкай на платформе іншых веравызнанняў. Таму неабходна гэтыя дзверы зачыніць" [9, с. 57-58]. Таму з прычыны развіцця беларускай мовы дзяржаўныя улады прымалі рашучыя дзеянні па недапушчэнні пашырэння ўніяцтва. Напрыклад, летам 1939 г. беластоцкі ваявода выказаў пастулат ліквідаваць уніяцкія парафіі ў Фастах, Курашэве і Касной, бо "у жыцці духоўных і вернікаў захоўваецца беларуская мова". Адначасова ўрад Польшчы зрабіў шэраг захадаў, каб унія "спрыяла дзяржаўнай палітыцы асіміляцыі беларусаў і ўкраінцаў, з чым не згаджалася ўніяцкае духавенства" [11, с. 77].

Каталіцкі Касцёл польскімі ўладамі ў далейшым актыўна выкарыстоўваўся ў якасці сродка паланізацыі: з 300 каталіцкіх газет і часопісаў II паловы 1930-х гг



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

абсалютная большасць друкавалася на польскай мове [8, с. 53–54]. У той жа час, беларускія ксяндзы таксама займаліся плённай працай на ніве беларушчыны, абараняючы ў Каталіцкім Касцёле беларускую культуру: ксёндз В. Гадлеўскі выдаў свой пераклад чатырох Евангелляў і кнігі Дзеі апосталаў у Вільні ў 1939 г. Аднак іх справаў было недастаткова, каб спыніць паланізатарскія тэндэнцыі знутры самога Касцёла: [1, с. 440–441].

**Літаратура**


1. Гісторыя Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэдактар) [і інш.]. – Мінск : Экаперспектыва, 2000–2006. – Т. 5 : Беларусь у 1917–1945 гг. / А. Вабішчэвіч [і інш.]. – 613 с.
2. Загідулін, А.М., Польская нацыянальная палітыка ў Заходняй Беларусі ў другой палове 30-х гг. XX ст. / А. М. Загідулін // Веснік Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Я. Купалы. 2010. – Серыя 1. – № 1. – С. 39–45.
3. История Беларуси : в контексте мировых цивилизаций : учебное пособие / В. Г. Голубович [и др.]; под ред. В. И. Голубовича, Ю. Н. Бохана. – Минск : Экоперспектива, 2009. – 464 с.
4. Кривуть, В. И. Участие силовых структур II РП в реализации концепции «государственного воспитания» / В. И. Кривуть // Веснік Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя С.А. Пушкіна. – 2013. – Серыя 2. – № 2. – С. 18–24.
5. Кушнер, В. Западная Беларусь в составе Польши / В.Ф. Кушнер // История Беларуси: в контексте мировых цивилизаций : учеб. пособие ; под ред. В. И. Голубовича, Ю.И. Бохана. – Минск, 2008. – С. 271–287.
6. Латышонак, А. Гісторыя Беларусі ад сярэдзіны XVIII да пачатку XXI ст. / Алег Латышонак, Яўген Міранoвіч. – 2-е выд. – Смаленск : інбелкульт, 2013. – 368 с.
7. Народный фотоальбом. 1000 фотографий о Бресте к 1000-летию города / Ю. Рубашевский. – Брест : ООО «РИА «Вечерний Брест», 2009 – 204 с.
8. Разуванава, К.С. Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры ў Заходняй Беларусі (1926–1936 гг.) / К.С. Разуванава. – Мінск : Беларуская навука, 2013. – 247 с. : іл.
9. Свірыд, А. Палітыка Другой Рэчы Паспалітай да ўніі на тэрыторыі Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) / А. Свірыд // Беларускі гістарычны часопіс. – 2002. – № 5. – С. 53–59.
10. Станкевіч, А.З Богам да Беларусі : Ззбор твораў. – Вільня : інстытут беларусістыкі, 2008. – 1097 с.
11. Туронак, Ю. Міжваенная унія ў Заходняй Беларусі / Ю. Туронак // Спадчына. – 1992. – № 5. – С. 73–78.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова